ГОМЕЛЬШЧЫНА

# «У 7.30 ужо стаялі на прыступках»

**У Гомельскай вобласці за пяць дзён датэрміновага галасавання 54,44 % выбаршчыкаў аддалі свае галасы за абраных кандыдатаў. Гомельшчына — лідар сярод рэгіёнаў краіны па актыўнасці людзей у гэты перыяд галасавання. Сёння, у асноўны дзень выбараў, на ўчастках таксама адзначаецца вельмі актыўная яўка.**


Тры пакаленні сям'і КОНЧЫЦ прыйшлі на выбары.

**Старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ** прыйшоў аддаць свой голас за кандыдата на выбарчы ўчастак № 20 Цэнтральнага раёна Гомеля, размешчаны ў корпусе ГДУ імя Ф. Скарыны.

— Я галасую за ажыццяўленне нашых планаў. Напрыклад, за заканчэнне будаўніцтва дзвюх корпусаў абласной туберкулёзнай бальніцы, годнае завяршэнне ўборачнай кампаніі. Таксама галасую за нараджэнне здаровых дзяцей, стварэнне сем'яў, за парадак, мір у дамах і на вуліцах, спакой у нашай краіне, — выказаў сваю пазіцыю кіраўнік рэгіёна.

Генадзь Салавей павіншаваў маладых людзей, якія ўпершыню бралі ўдзел у выбарах, і ўручыў ім памятныя падарункі.

Урач Гомельскай абласной туберкулёзнай бальніцы Яўгенія Жлоба прыйшла на выбарчы ўчастак у школу № 60 пасля дзяжурства.

— Я добра ведаю, якія цяжкія выпрабаванні выпалі на долю нашай краіны ў апошнія шэсць месяцаў. Мы ўсе аб'ядналіся і справіліся з каранавіруснай інфекцыяй. Вялікая заслуга кожнага чалавека і ўсяго народа ў тым, што мы можам бяспечна аддаць свой голас... Я аддаю свой — за спакой, светлую будучыню квітнеючай Беларусі, за магчымасць добра жыць і дастойна працаваць у сваёй краіне, — падзялілася спецыяліст, маці двух дзяцей.

Да выбарчага ўчастка № 6, што ў будынку сярэдняй школы № 29 Гомеля, цягнецца няспынны паток людзей. Сярод выбаршчыкаў — сталыя пары сужэнцаў, сем'і з дзецьмі, шмат моладзі.

Маладая гамяльчанка Вольга Гатальская апускае бюлетэнь у скрыню, потым з задавальненнем затрымліваецца, каб сказаць некалькі слоў пра ўдзел у выбарах. Кажа, што вельмі хвалявалася, бо для яе гэта вельмі сур'ёзная і адказная падзея:

— Я прыйшла аддаць свой голас за развіццё, за добрыя перамены.

Маці дваіх дзяцей, а цяпер і шчаслівая бабуля — Наталля Мікалаеўна Кончыц — прывяла на выбары ўсю сваю вялікую сям'ю:

— Марым пра тое, каб горад наш квітнеў і далей, пра шчаслівую будучыню для нашых дзяцей, за тое і галасуем, — дзеліцца меркаваннем гамяльчанка, для якой брацьудзел у выбарах — сямейная традыцыя.

Актыўны ўдзельнік усіх патрыятычных мерапрыемстваў у абласным цэнтры і Гомельскай вобласці, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Аляксей Іванавіч Піменаў на выбарчым участку № 6 прысутнічае ў якасці назіральніка. Арганізацыю галасавання ацэньвае на «выдатна»:

— Вельмі строга ўсё і дакладна, згодна з пратаколам. Што датычыцца маёй асабістай пазіцыі, то я — шчыры і нязменны прыхільнік дзеючага Прэзідэнта, — зазначае 94-гадовы гамяльчанін.

Між тым на ўчастках для галасавання акцэнтуецца ўвага на выкарыстанні ахоўных сродкаў. Усіх папярэджваюць аб пажаданым захаванні сацыяльнай дыстанцыі, гэта адзначае таксама назіральнік названага выбарчага ўчастка Ігар Ціток. Малады чалавек — электраманцёр на прадпрыемстве ААТ «Карал», дагэтуль двойчы назіральнік на выбарах дэпутатаў. На выбарах Прэзідэнта ў яго дэбют:

— Вельмі высокая яўка выбаршчыкаў была на датэрміновым галасаванні. У асноўны дзень таксама шматлюдна. Ніякай «напружанкі», праходзіць усё вельмі спакойна. Ідуць галасаваць і сталыя людзі, і моладзь, — зазначае Ігар Ціток і акцэнтуе ўвагу на наладжаным дзяжурстве спецыялістаў-медыкаў: перад пачаткам работы ў назіральнікаў і членаў выбарчай камісіі вымяраюць тэмпературу, а ў кабінках для галасавання своечасова праводзіцца апрацоўка паверхняў.

У Гомельскі абласны дом навучэнцаў і работнікаў устаноў прафадукацыі, дзе размясціўся ўчастак № 41, першыя выбаршчыкі прыйшлі яшчэ да адкрыцця.

Пажылыя сужэнцы Васіль і Вера Дзмітрачэнкі раней за ўсіх апусцілі бюлетэні ў скрыню для галасавання.

— Унутраны будзільнік спрацаваў — трэба збірацца галасаваць! Прыйшлі першыя — у 07:30 ужо стаялі на прыступках. Ды хіба гэта рана? Калісьці займалі чаргу, каб да шасці раніцы прагаласаваць, — прызналіся пенсіянеры.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

МІНШЧЫНА

# «За дабрабыт — каб мацнеў год ад года»

**Каля васьмі гадзін раніцы 9 жніўня на ганку будынка Бараўлянскага сельскага Савета дэпутатаў пачалі збірацца людзі. Менавіта тут размяшчаецца ўчастак для галасавання № 18. Адкрыцця яго чакалі некалькі чалавек. Іншыя пачалі падцягвацца пазней.**

— Усяго ў нас выбаршчыкаў 1555, у тым ліку 10 чалавек, якім споўнілася 18. Яны атрымаюць віншавальныя паштоўкі і падарункі, — расказала **старшыня ўчастковай камісіі Кацярына ХМЫЛКОВА.**

Асобны падарунак Кацярына Рыгораўна ўручыла і юбіляру. — Ларыса Генадзеўна 9 жніўня адзначае 60-годдзе. Жанчына падзякавала старшыні і членам выбарчай камісіі за ўвагу.

Галасаванне, як кажуць, прайшло ў штатным рэжыме, спакойна, без эксцэсаў. Было відаць, што людзі ідуць у прыўзнятым, святочным настроі.

— За што галасавалі? — пацікавілася ў мілавіднай жанчыны.

— За стабільнасць, — упэўнена адказала Лідзія Каваленка.

— Мне хутка споўніцца восемдзесят гадоў, — уступіла ў размову Ганна Іванаўна.

— Чаму ж не выклікалі членаў камісіі на дом? — пытаюся ў яе.

— Навошта людзей турбаваць? Я пакуль яшчэ здольная і сама дабрацца да ўчастка. А галасаваць буду за дабрабыт, каб ён мацнеў год ад года, каб раслі зарплаты. Думаю, пенсіі таксама паступова будуць павялічвацца.

— Мы прагаласавалі за тое, каб нашым нашчадкам жылося лепш. Прагаласавалі за росквіт і незалежнасць нашай краіны, — спыніліся побач Іван Аляксандравіч і Ганна Сцяпанаўна. — Мы раніцай нават унукаў разбудзілі, каб яны прыйшлі і зрабілі свой выбар.

На тэрыторыі Бараўлянскага сельсавета створана 29 выбарчых участкаў, прычым у гэтую кампанію па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дадаткова адкрыта сем новых.

— Гэта звязана перш за ўсё з тым, што кожны год у нас прырост насельніцтва складае каля чатырох тысяч. Сярод іх і людзі, якія дасягаюць 18-гадовага ўзросту і маюць права ўдзельнічаць у галасаванні, — канстатуе **старшыня Бараўлянскага сельскага Савета дэпутатаў Жанна ВАРАБЕЙ.** — З гэтых 29 участкаў шэсць закрытых. Яны размешчаны ва ўстановах ахові здароўя для галасавання хворых, якія знаходзяцца на момант правядзення выбараў на лячэнні. Рэалізаваць свае правы пацыенты могуць у асноўны дзень галасавання — 9 жніўня. Дзевяць выбарчых участкаў знаходзяцца ва ўстановах адукацыі. Адзін — ва ўстанове культуры. Астатнія — у інтэрнатах, службовых памяшканнях садовых таварыстваў. Мы фарміравалі ўчасткі і падбіралі памяшканні для іх з улікам таго, каб людзям было зручна дабірацца.

Усяго ж на тэрыторыі сельсавета маюць права ўдзельнічаць у галасаванні больш за 46 тысяч чалавек, у тым ліку 400 маладых людзей, якія дасягнулі 18 гадоў, 10 выбаршчыкаў, што адзначаюць той ці іншы юбілей з дня нараджэння. Ну, а да тых, хто па стане здароўя не можа з'явіцца на выбарчы ўчастак, члены камісіі выедуць дадому.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

МАГІЛЁЎШЧЫНА

# «ЗРАБІЦЬ ВАЖНЫ ВЫБАР»

**У Магілёве з самай раніцы актыўна ішло галасаванне. Прыходзілі цэлымі сем'ямі. Людзей забяспечвалі аднаразовымі пальчаткамі, медыцынскімі маскамі, антысептыкам. Працавалі буфеты і кірмашы.**



— Настрой святочны. Прагаласаваў за тое, каб у нашай краіны была мірная і шчаслівая будучыня. Гэта каштуе дорага, — падзяліўся ўражаннем **ваенны камісар Магілёўскай вобласці, палкоўнік, старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі РАА «Белая Русь» Аляксандр ГАРОШКІН,** які прыйшоў на выбарчы ўчастак № 76 пасля 10 гадзін раніцы.

Дарэчы, як адзначалі члены гэтай выбарчай камісіі., першыя наведвальнікі прыйшлі загадзя і чакалі, пакуль участкі адкрыюцца, каб прагаласаваць хутчэй. Нават чарга ўтварылася.

Выбары сталі знакавай падзеяй і для 100-гадовай магіляўчанкі Матроны Каленька, якая галасавала дома за тое,каб яе дзеці і унукі жылі ў квітнеючай краіне. Да яе завіталі члены камісіі з выбарчага ўчастка № 76, які размешчаны ў Доме ветэранаў.

Матрона Герасімаўна — паважаны чалавек. Пасля вайны прыйшла працаваць медсястрой у радзільнае аддзяленне і шчыравала там да 70 гадоў. Узнагароджана Ганаровымі граматамі. Яна маці траіх дзяцей, мае пяць унукаў і дзевяць праўнукаў.

Шматдзетныя бацькі-магіляўчане Дзмітрый і Наталля Гурэевы прыйшлі галасаваць з двухгадовай Сафіяй і чатырохгадовай Насценькай. Дома са сваякамі засталіся астатнія трое дзетак.

— Сёння для нас двайное свята — дзень выбараў і дзень нараджэння ў сямігадовай дачкі Паліны. Таму 9 жніўня для нас знакавы дзень, — кажа матуля. — У нас вялікая сям'я. Мару, каб дзеткі выраслі добрымі людзьмі і мы ганарыліся імі.

Пра тое, што ўдзел у выбарах — святы абавязак для кожнага, не раз паўтаралі і ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Так, Герасім Бераснеў прыйшоў галасаваць разам са сваёй другой палавінкай.

— Мы пражылі кроў на вайне. Як ніхто іншы ведаем цану міру. Яго варта захаваць у нашай роднай Беларусі. Сёння мы выбіраем гаспадара для краіны. Варта зрабіць правільны выбар, — падкрэсліў ветэран.

**Таццяна МАЛІНІНА, фота аўтара.**